View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Repository of Belarusian National Technical University...

79. Весялкоўскі Ю. Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гіст. нарыс) / Ю. Весялкоўскі. – Беласток; Лондан. [Рэд А. Міpановіч], 1996. – 361 с.

80. Мікніс Р. Літва і Беларусь: перэпетыі дзяржаўнасці ў пачатку 20 ст. / Р. Мікніс // Беларусіка – Albarutenika. – Мінск. – 1997. – Кн. 6. – Ч. I. – С. 249–257.

## Вершаваныя творы дзіцячага фальклору ў гульнявой традыцыі беларусаў (на матэрыялах другой паловы XIX–пачатку XX стст.)

Якубінская А. Дз. г. Мінск, БНТУ

Гульнявая традыцыя беларускіх сялян ўключае дзіцячыя гульні, вусную паэтычную творчасць (дзіцячы фальклор) і з’яўляецца надзвычай каштоўнай крыніцай для вывучэння культуры сацыялізацыі дзяцей, асабліва ў межах дзіцячай суполкі. Менавіта ў дзіцячай суполцы рэалізоўваліся такія сацыяльныя патрэбы хлопчыкаў і дзяўчынак, як патрэбы ў зносінах, атрыманні інфармацыі, эмацыянальным кантакце, сумеснай дзейнасці. Важна, што пры гэтым, як адзначае М.В. Асорына, фарміравалася пачуццё прыналежнасці, неабходнае для станаўлення асобы як члена грамадства [7, с. 53]. Асаблівасць сацыяльных паводзін малых у межах суполкі заключалася ў актыўным выкарыстанні імі твораў фальклору.

Да дзіцячага фальклору даследчыца Г.А. Барташэвіч адносіць “усе віды вуснай народнай паэзіі, створанай дарослымі для дзяцей, і творчасць саміх дзяцей, а таксама творы, якія перайшлі з рэпертуару дарослых у дзіцячую творчасць” [1, с. 29]. Да таго ж згодна з распрацаванай Г.А. Барташэвіч класіфікацыяй вершаваных жанраў беларускага дзіцячага фальклору вылучаюцца тры яго асобныя групы. У першую групу даследчыца ўключае творы дарослых для дзяцей малодшага ўзросту, калі яны здольныя толькі ўспрымаць дарослую творчасць (калыханкі і забаўлянкі) [1, с. 32]. Другую групу складаюць творы, якія суправаджаюць гульнявую дзейнасць (лічылкі, гульнявыя песні і гульнявыя прыгаворы) [1, с. 123]. Трэцяя група – гэта “творы “дарослага” рэпертуара (часткова) і дзіцячая творчасць (асноўная маса), не прымеркаваныя

для пэўнага часу, незалежныя ад гульняў, якія займаюць дзяцей сваім паэтычным зместам (песні, заклічкі, дражнілкі)” [1, с. 31]. Гэтая група ў асноўным з’яўляецца праявай уласнай дзіцячай творчасці, вынікам усвядомленага сацыякультурнага вопыту дзяцей, таму яна разглядаецца ў межах аналізу вершаваных твораў дзіцячага фальклору з мэтай вызначыць яе ролю ў гульнявой традыцыі беларускіх сялян другой паловы XIX–пачатку XX стст. Даследчыца М.В. Асорына адзначае, што дзіцячы фальклор можна разглядаць як спосаб аб’ектывацыі дзіцячай традыцыі, замацаваны ў корпусе тэкстаў [7, с. 51].

Прыкладна з пяці-сямі год пачынаецца новы этап у фарміраванні сацыяльнага вопыту дзіцяці, калі істотна пашыраюцца межы яго сацыяльнага свету: дзіця пачынае самастойна будаваць свае адносіны з чужымі, дарослымі і іншымі дзецьмі. Асаблівасцю гэтага ўзроставага перыяду з’яўляецца выкарыстанне дзецьмі дражнілак. Адметныя рысы гэтага жанру – імправізацыйнасць, шырокае напаўненне клішэ новымі дэталямі. Праз дражнілкі дзеці знаёміліся з маральнымі якасцямі і сацыяльнымі нормамі паводзін, прынятымі ў дзіцячым асяроддзі. Актуалізацыя выкарыстання дзецьмі фальклорнага матэрыялу прыпадае на перыяд ад шасці – васьмі да дванаццаці-чатырнаццаці год, што звязана з хуткім фізічным, псіхічным і сацыяльным развіццём дзіцяці і фарміраваннем “камунікатыўнай кампетэнцыі” (своеасаблівых навыкаў зносін) [7, с 49].

Барташэвіч Г.А. адзначала генетычныя карані дражнілак. На яе думку, іх паходжанне звязана са старажытнай “традыцыяй лаянкі, якая папярэднічала або спадарожнічала ўзброенай барацьбе” [1, с. 112]. Так ці іначай, узнікненне дражнілак у дзіцячым асяроддзі звязана з парушэннем міжасабовай этыкі. У якасці прыкладу можна прывесці дражнілку на хвалько:

– Жук, жук, дзе твой дом?

– Пад гумном.

– Ехалі татары, жука растапталі [8, с. 176].

Быў у іх і адваротны бок. Часам у дражнілках высмейваліся не толькі недахопы асобы, але разам з тым асаблівасці знешнасці дзіцяці, хаця адхіленне ад нормы магло быць і ўяўным:

Галушка-пушка,
Тоўстая, як грушка,

Урокі не вучыла,
Двойкі палучыла [3, с. 381].

Нават змены, якія адбыліся ў знешнім вобліку дзіцяці, маглі быць прычынай кпінаў, аб чым сведчыць дражнілка, звернутая да падстрыжанага:

Стрыжка-камарыжка!
У пограбе сядзеў,
Усіх мышэй паеў.
Адна мыш асталась,
У пограб захавалась.
Ён яе ташчыць,
А яна пішчыць [3, с. 384].

У агульным рэчышчы народнай смехавай культуры знаходзіліся дражнілкі з супрацьпастаўленнем асоб па полаўзроставай прыкмеце і адпаведным размеркаванннем умоўных дароў:

Дабы-дабы,
Дзеўкам – жабы,
Тыры-тыры,
Хлопцам – сыры! [3, с. 387]

Цікава, што большасць такіх дражнілак скіравана на высмейванне дзяўчынак і падкрэсліванне перавагі хлопчыкаў. Дадзеная акалічнасць абумоўлена фарміраваннем у хлапечай свядомасці ўяўлення аб больш актыўнай мужчынскай сацыяльнай ролі ў грамадстве, як ужо адзначалася вышэй. Але ёсць дражнілкі, дзе высмейваліся і хлопчыкі:

Дождж ідзець – грыбы будуць,
А на хлопцах гарбы будуць.
А на дзевак – роста,
На хлопцаў – кароста,
А на дзевак – красата,
А на хлопцаў – здыхата [3, с. 386].

Магчыма, частка падобных дражнілак была запазычана з фальклору дарослых, аб чым сведчаць лексемы “хлопцы” і “дзеўкі”, якія адсылаюць нас да шэрагу твораў, уласцівых абрадавым пікіроўкам моладзі падчас, напрыклад, Купалля і Масленіцы. У некаторых песнях адбываецца ўзроставая інверсія, калі да дарослых хлопцаў звяртаюцца, як да малых, тым самым, зневажаючы іх:

Сёння Купала, заўтра Ян,
Будзе, хлопчыкі, ліха вам [2, с. 80].

Сустракаюцца дражнілкі, у якіх высмейваюцца дзеці абодвух палоў:

Ад бацвіння – хлопцы свіння,
Ад капусты – дзеўкі тлусты [4, с. 204].

Сярод беларускіх дражнілак нярэдкія такія, дзе высмейваюцца асобы з асацыяльным тыпам паводзінаў і заганнымі прывычкамі:

П'яніца-няўдаліца!
Прапіў штаны і сарочку,
А сам сядзіць у куточку
Ды й хваліцца [3, с. 384].

Ёсць сярод беларускіх дражнілак і такія, што накіраваны нават на высмейванне членаў сям'і:

Дзяздіна – гадзіна,
Дзядзька – смоўж,
Дзядзька на дзядзіну
Узяў ды ўспоўз [4, с. 205].

Барташэвіч Г.А. адзначыла наяўнасць дражнілак, пабудаваных на канфесійных і нацыянальных дэталях [1, с. 116]. Згадваецца ў дражнілках род заняткаў чалавека, прычым не абавязкова наступны твор звернуты да сапраўднага пастуха, адрасатам мог быць любы хлопчык, бо ўсе вясковыя дзеці праходзілі гэту навуку:

Пастух, пастух,
Твой яловы трыбух.
Ты і ў доме жарэш,
І з сабою бярэш,
А прыйдзеш на поле –
Плачаш [3, с. 385].

Такім чынам, у беларускіх дзіцячых дражнілках, як і ў гульнях, закраналіся многія аспекты дарослага жыцця, фарміраваліся адносіны да нацыянальных, рэлігійных і сацыяльных груп насельніцтва. Праз іх дзеці набывалі першапачатковы сацыяльны вопыт, больш-менш усведамлялі асноўныя маральныя каштоўнасці сялян. Увогуле, дражнілкі з'яўляліся важным сродкам камунікацыі ў дзіцячай суполцы.

Важнай часткай гульнявай культуры дзяцей былі іх сумесныя паходы ў лес, на рэчку, за "зёлкамі" (лекавымі раслінамі), на пашу,

якія суправаджаліся пэўнай гульнявай дзейнасцю ў залежнасці ад сітуацыі. Розныя жыццёвыя сітуацыі, у якія патраплялі дзеці, вымагалі пэўных праяваў іх творчай актыўнасці, прыкладам якой могуць быць заклічкі і прыгаворы, якія не суправаджалі гульні дзяцей. "Заклічкі і прыгаворы – гэта паэтычныя звароты да сонца, дажджу, насякомых, птушак, раслін, а таксама кароткія песенькі-прыгаворкі, якія суправаджаюць некаторыя дзеянні: скаканне пасля купання, само купанне, гойданне на арэлях" [24, с. 104]. Так існавалі спецыяльныя прыгаворы купальшчыкаў, калі яны скакалі на адной назе, каб сагрэцца:

Колека, Колека,
Нагрэй чалавека,
Калі не нагрэеш,
Сама акалееш [8, с. 172].

Убачыўшы ў аднаго з сяброў ласунак, хлопчык ці дзяўчынка, заплюшчыўшы вочы і трасучы раскрытай далонькай, пачыналі прыгаворваць наступнае:

Кіў, кіў ручку,
Панскую сучку!
Хто дась, той князь,
Хто не дась, той гразь [8, с. 173].

Адмысловыя прыгаворы мелі не толькі забаўляльную функцыю. Дзеці верылі ў тое, што прыгавор павінен дапамагчы ў тым ці іншым выпадку. Напрыклад, заклічка-зварот да дожджу:

Дожджык, дажджык,
Перастань ліцца,
Бо маленькім дзетачкам
У хаце не сядзіцца.
Пойдуць у садочак,
Будуць весяліцца [4, с. 198].

Або, напрыклад, прыгавор ад "ікаўкі":

Едзь-едзь, ікаўка,
На сівой кабылцы.
Кабылка ўпала,
Ікаўка прапала [5, с 123].

Дзеці часта выкарыстоўвалі спецыяльныя прыгаворы, якія павінны былі, на думку малых, забяспечыць ім удачу ў збіральніцкай дзейнасці, аб чым яскрава сведчыць прыгавор грыбніка, запісаны ў Вілейскім раёне:

Чужыя грыбы пад імхом,
А мае грыбочкі вярхом, вярхом.
Чужыя грыбы пад лісточкам,
А мае грыбочкі пад кусточкам.
Чужыя грыбы пад лазінку,
А мае ў карзінку [4, с. 194].

Некаторыя заклічкі, асабліва звароты да сіл прыроды, прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага свету, на думку Г.А. Барташэвіч, "з'яўляюцца рэшткамі старадаўніх заклінальных песень, якім калісьці надаваўся магічны сэнс" [1, с. 104]. Сярод іх вельмі часта сустракаюцца звароты да дождж у:

Дожджык, дожджык, прыпусці,
Як у лесе тры кусты.
Богу маліцца,
Хрысту кланіцца,
Адчыняйце варата –
Едзе пан – сірата.
Ключыкам-замочкам,
Шаўковым платочкам.
Дзынь, бразь,
Выходзь быстра да нас, князь [4, с. 194–195].

Магчыма, з гэтым пэўным чынам звязана старадаўняя вера сялян у асаблівыя якасці дзяцей, іх здольнацьуплываць на сілы і з'явы прыроды, урадлівасць і плоднасць жывёлы. Напрыклад, у Сенненскім раёне Віцебскай вобласці была запісана заклічка, якая, верагодна, захоўвае рэшткі старажытнай метэаралагічнай магіі:

Божая кароўка,
Што заўтра будзе:
Дождж ці пагода,
Пень ці калода?
Пагода – ляці,
Дождж – сядзі,
Пень – дождж,
Калода – пагода [5, с. 120].

Такім чынам, заклічкі і прыгаворы з’яўляліся важнай сферай творчай актыўнасці дзяцей і суправаджалі іх дзеянні ў пэўных жыццёвых сітуацыях. Гэта было абумоўлена не толькі займальным характарам дадзеных фальклорных твораў, але і верай дзяцей у іх карыснасць. Да таго ж скандэнсаваны ў іх эстэтычны і жыццёвы вопыт спрыяў працэсу інкультурацыі дзяцей, іх далучэнню да традыцыйнай культуры. Праз выкарыстанне заклічак і прыгавораў набываўся ўласны камунікатыўны вопыт дзіцяці, бо яны былі адным з атрыбутаў стасункаў у дзіцячай суполцы.

Як адзначае М.В. Асорына, цікавасць да выкарыстання так званых “патаемных моў”, усялякага роду сакрэтаў і таямніц ў васьмі – дванаццацігадовым узросце абумоўлены актыўным пошукам дзецьмі мовы сацыяльных адносін з навакольным светам [7, с. 55]. Так, захаваліся незразумелыя дарослым прыгаворы, якія шырока бытавалі ў дзіцячай суполцы:

А ты, шындаль-біндаль, што нашындаль,
Гарцу, барцу, з кулагрынцу – кох! [6, 175].

Асабліва важнае значэнне для разумення паняццяў норма і адхіленне ад яе мелі небыліцы. Г.А. Барташэвіч адзначае, што “характэрнай рысай многіх дзіцячых песень з’яўляецца незвычайнасць адлюстраваных у іх дзеянняў, відавочная неадпаведнасць іх рэальнаму свету” [1, с. 89]. Прыкладам такіх песень з’яўляецца небыліца, запісаная ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці:

Сівая свіння
На дубе гняздо звіла,
На дубе гняздо звіла,
Казлятачак прывяла [5, с. 103].

Праз небыліцы было лёгка асвойваць сацыяльны ланшафт грамадства, аб чым сведчыць песня з Добрушскага раёна, у якой пералічваюцца пэўныя асобы сялянскага соцыуму:

А-гу-гу, а-гу-гу,
Сядзіць голуб на дубу.
У скрыпачку грае, дзетак забаўляе.
А вы, дзеткі, знайце, па капейцы дайце.
Я пайду на горку, куплю сабе жонку,
А жонка дурная, цялятак не знае.
Цяляткі рыкнулі – сабакі пачулі

Дый папу сказалі.
Поп з печкі – паламаў плечкі,
А дзяк з калыскі – выпусціў кішкі.
Курачка сакоча, кішочкі валоча.
Пеўнік даганяе – кішкі падымае [4, с. 237]

Праз небыліцы дзеці засвойвалі і розныя жыццёвыя з'явы, нават такія жудасныя, як смерць. Але тут нават яна падавалася ў гульнявым варыянце, неразбуральным для дзіцячай псіхікі:

Прывязлі камарочка ды на мары,
Насустрэчу ўсё баяр'я:
– А што гэтаў вас за пакойнік?
– Не князь, не паннік,
Не кароль, не палясоўнік –
Самы бедны камарочак [3, с. 250].

Некаторыя песні маюць яскравую гендэрную скіраванасць. У іх дакладна пазначаюцца сацыяльныя ролі, напрыклад хлопчыка, прычым на працягу яго сталення:

Слава Богу і Хрысту,
Што я хлопчыкам расту:
Я ігрэц у ражок,
Я для быдла пастушок,
Я на лузе касец,
Я для качара стралец
І для дзевак маладзец [3, с. 344].

Такім чынам, вершаваныя творы дзіцячага фальклору з'яўляюцца важнай часткай камунікатыўнага вопыту дзяцей. Дражнілкі, прыгаворы, таемныя мовы, песні-небыліцы ў межах гульнявой традыцыі беларускіх сялян з'яўляліся сродкам сацыялізацыі дзяцей даючы магчымагчымасць усведамлення свайго месца ў дзіцячай суполцы, вырашэння пэўных праблем, выхаду з канфліктных сітуацый. Існаванне традыцыі забяспечвалася трансляцыяй твораў ад старэйшых да малодшых, спрыяючы больш хуткай сацыялізацыі дзіцяці праз прадастаўленне яму ўжо гатовых славесных формул, неабходных для самаідэнтыфікацыі.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Барташэвіч, Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г.А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 168 с.

2.Беларускія народныя абрады / Склад., навук. рэд. Л.П. Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – 128 с.

3. Дзіцячы фальклор / Склад., уступ. арт. Г.А. Барташэвіч; рэдкал. В.К. Бандарчык [і інш.]; рэд. тома К.П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 734 с.

4. Дзіцячы фальклор: зб. фальклор. матэрыялаў / рэд. кал. У.А. Васілевіч (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.

5. Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах: дапаможнік / склад. А.С. Емельянаў, Г.П. Харошка. – Віцебск: Выд-ва УА ВДУ імя П.М. Машэрава, 2007. – 200 с.

6. Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья / В.К. Бондарчик [и др.] редкол.: В.К. Бондарчик [и др.] – Минск: Наука и техника, 1987. – 379 с.

7. Осорина, М.В. О некоторых традиционных формах коммуникативного поведения детей / М.В. Осорина // Этнические стереотипы поведения; под ред. А.К. Байбурина. – Л.: Наука, 1985. – 325 с. – С. 47–64.

8. Романов, Е.Р. Материалы по этнографии Гродненской Губернии / Е.Р. Романов. – Вып. 1. – Вильно: Русский почин, 1911. – 239 с.